Установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”

Факультэт беларускай і рускай філалогіі

Кафедра беларускага мовазнаўства

**Мароз**
**Наталія Ігараўна**

# ФАЎНІСТЫЧНЫЯ НАЗВЫ Ў ФРАЗЕАЛАГІЧНЫХ АДЗІНКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Дыпломнае даследаванне

Навуковы кіраўнік –
кандыдат філалагічных навук,
дацэнт Старасценка Т. Я.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мінск, 2013

# РЭЗЮМЭ

Мароз Наталія Ігараўна

## ФАЎНІСТЫЧНЫЯ НАЗВЫ Ў ФРАЗЕАЛАГІЧНЫХ АДЗІНКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

**Ключавыя словы:** фразеалогія, фразеалагічная адзінка, лексіка-семантычныя групы, фаўністычныя назвы, структурныя тыпы, фразеалагізмы-словазлучэнні, фразеалагізмы-сказы, фразеалагізмы-спалучэнні, стылістычнае значэнне фразеалагізмаў, функцыянальна-стылявыя разрады фразеалагізмаў, стылістычныя функцыі фразеалагізмаў.

**Аб'ектам даследавання** дыпломнай працы з'яўляюцца фразеалагічныя адзінкі беларускай мовы.

**Прадмет даследавання** – фразеалагізмы з фаўністычныя кампанентам.

**Мэта** дыпломнай працы – прааналізаваць фразеалагізмы з фаўністычным кампанентам.

**Метады праведзенага даследавання** – быў выкарыстаны комплекс агульнанавуковых метадаў (класіфікацыя, аналіз) і апісальны, супастаўляльны і статыстычны метады даследавання.

У дыпломнай працы разглядаюцца фразеалагізмы з фаўністычным кампанентам, якія даследуюцца па семантычных групах, па семантычнай злітнасці кампанентаў, па суаднoснасці з часцінамі мовы, па структурных тыпах, па стылістычных функцыях.

**Актуальнасць даследавання:** асаблівасці фразеалагізмаў, якія ўтрымліваюць у сабе фаўністычныя назвы, не атрымалі глыбокага тэарытычнага і практычнага асэнсавання ў сучаснай беларускай лінгвістыцы. Гэтым і абумоўлены выбар дыпломнай працы.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Матэрыялы дыпломнай работы могуць быць выкарыстаны ў далейшых даследаваннях фразеалагізмаў з фаўністычным кампанентам, пры падрыхтоўцы да спецсемінараў па тэмах, якія адносяцца да такіх дысцыплін, як сучасная беларуская літаратурная мова, актуальныя праблемы мовазнаўства і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ